ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 260 (332) | Пятніца 15 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

На прызыўным пункце ў горадзе Пружаны

Другі дзень ідзе прызыў у Пружанскім раёне моладзі ў школы фабрычна-заводскага абучэння і рамесленыя вучылішчы. Усяго з Пружанскага раёна згодна развёрткі патрэбна паслаць 132 чалавекі ў рамесленыя вучылішчы горада Брэста і ў Гайнаўскую школу фабрычна-заводскага абучэння.

Выключна вялікая пята прадоўнай моладзі раёна пайшоў вучыцца ў рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. На 132 месцы ўжо падана больш 330 заяў ад дзяцей сялян, калгаснікаў, рабочых і служачых. Сярод падаўшых заявы 30 маладых калгаснікаў з калгасаў „1 Мая", „Большэвік", „Чырвоны сцяг", ад дзяцей рабочых саўгаса „Белавусаўшчына".

У першы дзень прызыва прынята многа маладых калгаснікаў, усе яны фізічна развітыя, пісьменныя. Камісія накіравала іх у Гайнаўскую школу фабрычна-заводскага абучэння і ў Брэсцкія рамесленыя вучылішчы.

Размеркаванне даходаў у калгасах — справа велізарнай важнасці

Высокімі паказчыкамі атрымання ўраджайнасці адзначаюць калгаснікі вобласці першы год жыцця ў калгасах. Калгасы Пружанскага і Кобрынскага раёнаў у сярэднім з кожнага гектара знялі па 13 центнераў жыта. Калгасы Брэсцкага раёна знялі па 10,8 центнера яравых. Калгасы Косаўскага раёна знялі па 170 центнераў бульбы. Калгас імені Чырвонай Арміі, Жабінкаўскага раёна, атрымаў 23.563 руб. грашовага даходу і інш.

Высокі валавы збор хлеба, бульбы і гародніны ў калгасах умацоўвае калгасную гаспадарку, забяспечвае высокую каштоўнасць працадзён калгаснікаў, наглядна паказвае перавагу калгаснай працы перад працай аднаасобнай.

У калгасе імені Сталіна, Жабінкаўскага раёна, пасля разлікаў з дзяржавай і стварэння ўсіх неабходных грамадскіх фондаў, на працадзень прыпадае 5,02 кілограма зернавых, 24,9 кілограма бульбы, 6,7 кілограма грубых кормоў.

Калгаснікам, якія чесна працавалі ў абагуленай гаспадарцы, забяспечана заможнае жыццё. К прыкладу можна ўзяць таварыша Шакоўскага С. Н. Яго сям'я з 4 працаздольных на 1 верасня выпрацавала 515 працадзён і атрымала ўжо авансам 14 центнераў хлеба, 62 центнеры бульбы, 548 рублёў грашыма. Пры канчатковым разліку ў канцы года гэта сям'я атрымае 26,78 центнера хлеба, 145,35 центнера бульбы і кала 800 рублёў грашыма.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа і з іншых калгасаў вобласці. Калгаснікі з гордасцю падводзяць вынікі багатых пладоў сваёй працы, рыхтуюцца к таму, каб правільна размеркаваць даходы.

„Размеркаванне даходаў у калгасах — справа велізарнай важнасці. Умела распарадзіцца арцельнымі даходамі — гэта значыць стварыць прадпасылкі, творчую аснову для новага падёму калгаснай вытворчасці, правільна па-сацыялістычнаму аплаціць працу вільёнаў калгаснікаў. Абавязак мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый — дапамагчы калгасам узорна выканаць гэтую задачу, дапамагчы ім пазбегнуць памылак мінулага года, калі ў радзе раёнаў інтарэсы грамадскай гаспадаркі былі ўшчамлёны, адсунуты на задні план" („Правда" за 10 лістапада).

З падрыхтоўкай да размеркавання калгасных даходаў у нашай вобласці аостаюць нездавальняюча. У радзе калгасаў яшчэ не скончан абмалот некаторых культур, не вытвараны поўнасцю разлік за работу МТС, не створаны грамадскія фонды.

Калгасы „Большэвік" Пружанскага раёна, „17 верасня" Брэсцкага раёна, імені Сталіна Ружанскага — зацягваюць малацьбу зернавых. Калгас імені Сталіна, Брэсцкага раёна, зацягвае ўплату 56 центнераў зерна за работу МТС. Такая-ж з'ява назіраецца і ў радзе іншых калгасаў. Грамадскія фонды не адшыпаны асобна ад агульнанамалочанага калгаснага хлеба. Усё гэта тормозіць падрыхтоўку да размеркавання даходаў.

Перадавыя калгаснікі добра ведаюць, што рост калгаснага багацця і заможнасці калгаснікаў немыслімы без развіцця грамадскай жывёлагадоўлі і павелічэння яе прадукцыйнасці. Выходзячы з гэтага яны ўсямерна клапоцяцца аб стварэнні моцнай кармовай базы для грамадскай жывёлы. Высокая ўраджайнасць гэтага года дазваляе кожнаму калгасу забяспечыць усю сваю жывёлу — коней, кароў, свіней, авец на ўвесь год канцентратамі. Аднак у вобласці знайшліся і такія нерадзівыя гаспадары, якія нацэліліся размеркаваць на працадні як мага больш прадуктаў, не забяспечыўшы калгаснае стада канцэнтратамі.

У калгасе імені Варашылава, Камянецкага раёна, намецілі да выдачы на працадзень па 7,2 кілограма зернавых у той час, як на 26 коней і 4 свінаматак засыпалі ўсяго 30 центнераў зярна. Вось такі падыход да справы размеркавання даходаў ёсць антыкалгаспая, антыдзяржаўная справа, якая не ўмацоўвае калгаснай гаспадаркі. Кожнаму калгаснику зразумела, што чым лепш карміць і даглядаць калгаснага каня, тым больш ён будзе працаздольны на выкананне любой калгаснай работы, ад чаго будзе залежыць поспех усіх калгасных работ. Чым сытней карміць калгасную карову, тым больш яна дасць малака. Чым сытней карміць свінню, тым больш яна дасць прыплоду і выхаду прадукцыі, тым больш грошы і прадукцыі выйдзе атрымаць на працадзень калгаснику.

Сацыялістычны прынцып аплаты працы гласіць: хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае. Гэтага прынцыпу і павінны трымацца ўсе калгасы ў налічэнні працадзён і аплаты іх. Аднак, у радзе калгасаў мае месца нарушэнне гэтага прынцыпу, дапускаецца разбазарванне працадзён і абясцэнка іх. У калгасе „Большэвік", Пружанскага раёна, 2 вартаўнікам, якія працуюць пачаргова праз суткі, налічваюць 2,5 працадня за дзень. Тут умудрыліся нават налічыць 198 працадзён пастуху за пасьбу авечак калгаснікаў. Такому падыходу да справы налічэння працадзён павінен быць пакладзен канец.

Ёсць выпадкі, калі ў некаторых калгасах так захапіліся выдачай натуральных авансаў, што выдалі больш, чым прылічаецца атрымаць па канчатковаму размеркаванню. Так атрымалася ў калгасе „Красное знамя", Поразаўскага раёна.

Яўна нездавальняюча абстаяць справы ў некаторых калгасах з улікам калгаснага дабра і працадзён, а таксама выданых авансаў („Большэвік" Пружанскага раёна, імені Сталіна Поразаўскага раёна).

1940 год на выходзе. Каб прыступіць да размеркавання сваіх даходаў, калгасы абавязаны ў бліжэйшыя дні закончыць разлік з дзяржавай, закончыць малацьбу, засыпаць поўнасцю ўсе грамадскія фонды, правільна ўлічыць і запрыходаваць усю атрыманую прадукцыю, правільна улічыць усе працадні. Рэвізійныя камісіі абавязаны зрабіць дасканалую рэвізію ўсіх спраў калгасаў.

Райкомам партыі, райземаддзелам і МТС узяць пад свой штодзённы кантроль работу калгасаў, жывіць работу рэвізійных камісій, арганізаваць падрыхтоўку да правядзення размеркавання так, як гэтага патрабуе калгасны статут, як патрабуе рашэнне ЦК ВКП(б) і СНК СССР „Аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў".

На Тэльманскім выбарчым участку работа не распачата

Рэдакцыя газеты „Зара" дала групе сваіх рабкораў адказнае заданне — азнаёміцца з пастаноўкай работы па радзе выбарчых участкаў горада. Нашай брыгадзе было даручана праверыць работу на Тэльманскім выбарчым участку. Цэнтр участка знаходзіцца ў першай школе па вуліцы Дзержынскага № 110.

Адправіліся мы на ўчастак 12 лістапада ў 8 гадзін вечара. У калідоры школы, ля самага ўваходу, вісіць надпіс, указваючы, што Тэльманскі выбарчы ўчастак знаходзіцца ў пакоі № 18. На дзвярах гэтага пакою — такі-ж надпіс. Заходзім у клас. Знаходзім намала людзей — гэта выбаршчыкі прышлі правяраць, ці занесены яны ў спісы. Ля столікаў дружна працуюць людзі — члены выбарчай камісіі. Пытаем, ці тут знаходзіцца патрэбны нам выбарчы ўчастак.

— Не, заяўляюць нам, гэта Чкалаўскі ўчастак.

А дзе-ж Тэльманскі?

Нам указваюць на суседні пакой. Але там знаходзіцца цэнтр Першамайскага ўчастка. Гэта крыху нас збянтэжыла. Чаму гэта ў адным месцы сабралі тры выбарчыя ўчасткі? Наўрад ці гэта зручна для выбаршчыкаў.

Але дзе ж усё-такі наш выбарчы ўчастак? Яго, аказваецца, яшчэ няма.

Можа ёсць хто з членаў участковай камісіі, агітатараў, актыва?

— Не, іх тут не бывае, з дакорам паведамляюць нам таварышы з суседніх участкаў.

Чакаем каля гадзіны. У школе панае ажыўленне — збіраюцца на сход выбаршчыкі Чкалаўскага ўчастка. Але нашых людзей няма.

Тут больш рабіць няма чаго. Адпраўляемся да выбаршчыкаў, ідзем мы па тэрыторыі 106 выбарчай акругі (вуліца Маскоўскай вуліцы). Пабылі мы ў 10 кватэрах. Усюды задаем аднатыпныя пытанні: ці былі ў вас агітатары, ці прыходзілі да вас людзі для праверкі спісаў выбаршчыкаў. І ўсюды чуем адзін і той-жа адказ: — не, не былі ў нас... Многія жыхары гэтай акругі не ведаюць нават, калі адбудуцца выбары. На адной кватэры нас абрадавалі адказам, што былі калісьці ў іх агітатары ў сувязі з выбарамі. Аказваецца, што было гэта... у час падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР.

Заходзім у дом № 123. Тут паводле апублікаванай пастановы горвыканкома, павінны знаходзіцца цэнтры двух выбарчых акруг (№№ 110 і 111). Тут жыхары былі вельмі здзіўлены нашымі пытаннямі аб тым, што тут павінны знаходзіцца выбарчыя камісіі, ніхто аб гэтым у доме не ведае.

Наведалі мы цэнтр Тэльманскага выбарчага ўчастка і на другі дзень — 13 лістапада. Рэзультаты зноў тыя-ж самыя.

Асобныя каментарыі не патрэбны. Толькі хочам дадаць, што ўчастковую выбарчую камісію ўзначальваюць работнікі педагагічнага вучылішча тт. Мікульскі, Ткачоў, Эсментовіч і што агітацыйную работу сярод выбаршчыкаў гэтага ўчастка павінна праводзіць партыйная арганізацыя і калектыў педагагічнага вучылішча.

Як можна мірыцца з такімі безадказнымі адносінамі да важнейшай дзяржаўнай работы?

І. Лібгабер,
А. Яблонскі.

Ад усяго сэрца

(На занятках гуртка)

У невялікім, але ўтульным пакоі чытальні бібліятэкі сабраліся выбаршчыкі 20 акругі па выбарах у Маларыцкі пасялковы Совет дэпутатаў працоўных. Раней за ўсіх прышла агітатар Ноэм Маркаўна Каверберг. Калі выбаршчыкі расселіся па месцах, агітатар распачала гутарку.

— Сёння тэма нашых занятак, — гаворыць агітатар, — сельскі Совет дэпутатаў працоўных. У другім артыкуле Канстытуцыі БССР запісана, што палітычную аснову БССР складаюць Советы дэпутатаў працоўных. Советы дэпутатаў працоўных выраслі і замацаваліся ў выніку звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў і замацавання дыктатуры пролетарыята.

Уся ўлада ў нашай краіне належыць працоўным горада і вёскі ў асобе дэпутатаў працоўных. Прадстаўнікоў у вышэйшыя органы ўлады мы з вамі ўжо выбралі, — гэта нашы дэпутаты ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР. А вось зараз, 15 снежня, мы будзем выбіраць дэпутатаў у мясцовыя органы совецкай улады, — абласныя, раённыя, гарадскія і сельскія Советы дэпутатаў працоўных.

Паступова, упэўнена і ўдумліва агітатар расказвае як стваралися Советы. Яна гаворыць аб тым, што ініцыятарамі і арганізатарамі Советаў з'яўляліся вялікія правадыры пролетарыята Ленін і Сталін. Намалёван выдатны малюнак дасягненняў нашай радзімы, завяваных пад сцягам Советаў. І агітатар падкрэслівае, што гэтыя дасягненні здабыты ў барацьбе з міжнароднай інтэрвенцыяй у час грамадзянскай вайны, у барацьбе з унутранымі ворагамі рэвалюцыі — рэшткамі недабітых класававарожых элементаў.

— Советы з'яўляюцца адзінымі сапраўды дэмакратычнымі органамі ўлады ва ўсім свеце, — працягвае агітатар. — Кожны з нас памятае выбары ў польскі сейм, разгул рэакцыі ў час выбарчае кампаніі. Дзесяткі нацыяналістычных і так званых дэмакратычных партый у панскай Польшчы вялі барацьбу за тое, каб у сейм і мясцовыя органы ўлады праходзілі сваіх дэпутатаў. Але народ гэтага не дазваляе лаг[illegible]

— Іншая справа зараз. Мы ўжо выбралі і будзем выбіраць сваіх прадстаўнікоў у родныя органы сапраўды народнай совецкай улады. Мы выбіраем лепшых людзей вызваленага народа.

Далей агітатар на мясцовых прыкладах жыцця гарадскога пасёлка паказвае, якую вялікую і ўдзячную работу праводзяць Советы. Яна падкрэслівае вялікую адказнасць, якая ўскладаецца на мясцовыя Советы і іх дэпутатаў. Абавязак мясцовых Советаў — змагацца за палепшэнне добрабыту насельніцтва, умацоўванне нашай родная социалістычнай дзяржавы.

* * *

Ноэм Маркаўна Каверберг — прадстаўнік маладых новых агітатараў, якія ўключыліся ў работу толькі ў часе выбарчай кампаніі. Гэты таварыш поўнасцю аддала сваё вялікай і ганаровай расоце агітатара. Яна працуе ад усяго сэрца. І выбаршчыкі вельмі задаволены яе работай.

— Якая радасць працаваць у совецкай краіне, — гаворыць агітатар. — Ты адчуваеш, што твае працу цэняць, што ты творыш вялікую і карысную справу.

Гісторыя жыцця гэтай жанчыны — звычайная гісторыя жыцця тысяч былых прыгнечаных жанчын. За апошнія капейкі яе бацькі стараліся вучыць і яна вучылася надзвычай. У 1934 годзе тав. Каверберг скончыла Варшаўскі юрыдычны факультэт з выдатнай адзнакай, але работы ёй не далі толькі таму, што яна яўрэйка.

З прыходам совецкай улады тав. Каверберг атрымала работу і працуе зараз адвакатам пры Маларыцкім народным судзе. За тры месяцы сваёй работы яна завяявала сімпатыі насельніцтва. Ноэм Маркаўна зрабіла чатыры даклады аб совецкім законадаўстве, чытала даклады для насельніцтва аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня.

Жывая і энергічная, яна працуе з агонькам, поўнасцю аддаючы свае сілы і веды вялікай і [illegible]

Усебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва „Ленін і Сталін — арганізатары БССР" у Мінску.

На здымку: Экскурсанты — байцы Н-скай часці аглядваюць скульптуру заслужанага дзеяча мастацтваў БССР ордэнаносца З. І. Азгура „І. В. Сталін — тварэц Канстытуцыі социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян".

Фота Б. Хеніна і В. Лупейка. *Фотахроніка Белта.*

Кандыдаты ў дэпутаты раённага Совета

У Расянскім сельсавеце, Высокаўскага раёна, зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты раённага Совета дэпутатаў працоўных лепшыя людзі.

Чэпелеўская акруговая выбарчая камісія № 31 зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты раённага Совета тав. Філіянава, сакратара раённага камітэта партыі, вылучанага агульным сходам сялян вёскі Чэпелі.

Расянская акруговая выбарчая камісія № 30 зарэгістравала кандыдатам у дэпутаты раённага Совета настаўніцу Расянскай школы Марыю Пятроўну Брудко, па нацыянальнасці польку, якая працуе ў якасці настаўніцы 5 год. Кандыдатуру тав. Брудко вылучылі на агульных сходах сялян вёсак Расна і Новая Расна.

М. Лагвінюк.

Работа ў хаце-чытальні

Наша хата-чытальня пачала працаваць толькі летам гэтага года. Была арганізавана бібліятэка, выпісаны газеты, набыты шашкі, шахматы, даміно. З дапамогай настаўнікаў мясцовай школы былі арганізаваны музыкальны, харавы і драматычны гурткі, якія зараз з поспехам выступаюць перад насельніцтвам.

Хата-чытальня стала сапраўдным цэнтрам агітацыйна-масавай работы на вёсцы. Зараз, калі распачаліся выбары ў мясцовыя Советы ў вольны ад работы час у двух пакоях чытальні бываюць дзесяткі людзей. Наладжваюцца громкія чыткі газет. Раз у тыдзень праводзяцца заняткі гуртка па бягучай палітыцы. Кіруе гэтым гурткам настаўнік тав. Смірноў. Арганізаваліся і распачалі працаваць два гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона.

Уся работа хаты-чытальні праходзіць па плану, распрацаваным расклад заняткаў гурткоў.

Перад культасветработнікамі стаяць вялікія задачы. Мы павінны ў нашых хатах-чытальнях арганізаваць так работу, каб у кожны выбаршчык змог атрымаць адказ на цікавячае яго пытанне.

Смактуновіч,
загадчык Нароўскай хаты-чытальні, Гайнаўскага раёна.

Акруговая камісія за работай

Акруговая камісія № 23 па выбарах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных разгарнула работу.

Кожны член камісіі мае 10-дворку, знаёміўся з выбаршчыкамі, праводзіў гутаркі аб прадстаячых выбарах. Тут-жа мы ўдакладнялі складзеныя папярэдне спісы выбаршчыкаў. На акрузе налічваюцца 243 выбаршчыкі. Мы выявілі, што 7 выбаршчыкаў не занесены ў папярэднія спісы і 2 чалавекі з занесеных выбылі.

Першага лістапада ўдакладнёныя спісы выбаршчыкаў мы здалі ў горвыканком.

З пачуццём гонару члены камісіі адносяцца да сваёй пачэснай работы, якую ім даверылі выбаршчыкі. Кожны з нас стараецца ўзорна падрыхтавацца і правесці выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Г. Н. Кузаўка, старшыня 23 выбарчай акругі па выбарах у Брэсцкі гарадскі Совет.

Прыём у п. фон-Рыбентропа ў чэсць таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Вечарам 12 лістапада міністр замежных спраў Германіі п. фон-Рыбентроп наладзіў прыём у чэсць Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава.

На прыёме прысутнічалі кіруючыя дзеячы германскіх урадавых органаў, нацыянал-сацыялістычнай партыі, прадстаўнікі вышэйшага камандавання Германскай Арміі, а таксама асобы, суправаджаючыя тав. В. М. Молатава, наўпрад СССР у Берліне тав. Шкварцаў і адказныя работнікі наўпрадства СССР.

П. фон Рыбентроп і тав. В. М. Молатаў абменаліся прамовамі.

Наведанне Старшынёй Соўнаркома СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварыша В. М. Молатавым рэйхсмаршала Герынга і намес[illegible] п. Геса

Напярэдадні юбілейных урачыстасцей у Ерэване

ЕРЭВАН, 14 лістапада. (ТАСС). У сталіцы ўжо адчуваецца перадсвяточнае ажыўленне. З вялікім натхненнем працоўныя рыхтуюцца да 20-годдзя Совецкай Арменіі. Знаменальная дата адзначаецца 24 лістапада. У горадзе пакрываецца асфальтам апошні ўчастак плошчы супроць будынка ўрада. Кіравы, дзе будуецца абеліск у чэсць Чырвонай Арміі.

У абшырных залах Гістарычнага музея гатова да адкрыцця вялікая юбілейная выстаўка. Са ўсіх канцоў рэспублікі туды дастаўлены экспанаты, характарызуючыя дасягненні Армянскай ССР за ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры. На вы[illegible]

Абласная нарада сакратароў райкомаў КП(б)Б

На днях у абкоме КП(б)Б адбылася нарада сакратароў райкомаў партыі. На нарадзе ў асноўным абмяркоўвалася пытанне аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных.

Па гэтаму пытанню нарада заслухала інфармацыі сакратароў райкомаў: Пружанскага — т. Стулава, Бярозаўскага — т. Снегава, Косаўскага — т. Дварэцкага, Камянецкага — т. Радзюка і Брэсцкага — т. Дзядзева.

Інфармацыі з месц паказалі, што паўсямесна выбарчая кампанія праходзіць пры вялікай палітычнай актыўнасці насельніцтва. Прадвыбарчыя сходы працоўных па вылучэнню кандыдатаў у депутаты абласнога і раённых Советаў, акруговыя прадвыбарчыя нарады прадстаўнікоў працоўных прайшлі ў асноўным арганізавана, кандыдаты, высунутыя блокам комуністаў і беспартыйных, падтрымліваюцца дружна масамі працоўных.

Вельмі важна адзначыць, што масы працоўных сялян сур'ёзна падыходзяць да вылучэння кандыдатаў у депутаты, строга сочаць за тым, каб у Советы былі пасланы сапраўды перадавыя людзі, на практычнай рабоце даказаўшыя сваю адданасць Совецкай уладзе.

Побач з гэтым, факты гаворуць аб росце актыўнасці класава-варожых элементаў, якія імкнуцца перашкодзіць паспяховаму правядзенню выбараў.

Выступленні з месц паказалі, што размах агітацыйнай работы яўна яшчэ недавальняючы, агітацыя за кандыдатаў фактычна не распачалася. Значныя групы выбаршчыкаў не ахоплены вывучэннем выбарчага закона. У радзе раёнаў адчуваецца востры недахоп выбарчай літаратуры.

У раёнах праводзіцца работа па інструктажу членаў участковых і акруговых выбарчых камісій. Але работа па афармленню цэнтраў выбарчых участкаў не разгорнута, амаса членаў выбарчых камісій да актыўнай работы яшчэ не прыцягнута. У асобных месцах выяўлены факты, калі ў некаторыя выбарчыя камісіі прабраліся недастойныя людзі.

Сакратар абкома партыі па прапагандзе т. Беляеў у сваім выступленні завастрыў увагу сакратароў райкомаў на неабходнасць карэннага палепшання кіраўніцтва агітацыйнай работы. Па даных райкомаў па вобласці зараз прыцягнута да агітацыйнай работы 11 тысяч чалавек. Гэтай арміяй трэба штодзённа кіраваць, іх работу правяраць, ім дапамагаць. Між тым у радзе месц падмяняюць крапатлівую дзелавую работу туманнымі. Нашы агітатары яшчэ не дайшлі да аддалёных вёсак, хутароў. Некаторыя кіраўнікі агітколектываў—госці ў сельсоветах. Між тым патрабуецца сур'ёзны кантроль. Важна кожная дэталь, у тым ліку памяшканне, у якім праводзяцца заняткі. У Высокаўскім раёне ў адной з вёсак заняткі гуртка былі наладжаны на кватэры кулака, пры чым апошні скарыстаў аўдыторыю для варожай агітацыі. Агітатар аказаўся зусім навопытным таварышом, які не мог на месцы даць адпор кулацкай агітацыі.

Тав. Беляеў указвае, што неабходна ўжо зараз разгарнуць агітацыю за зарэгістраваных кандыдатаў.

Сакратар абкома партыі тав. Тупіцын у сваім выступленні падверг крытыцы работу асобных райкомаў, у прыватнасці Бярозаўскага, за адсутнасць належнай большэвіцкай чоткасці ў кіраўніцтве выбарчай кампаніяй, за нерастатковае разгортванне масава-палітычнай работы.

Тав. Тупіцын на радзе фактаў паказаў, што выбарчая кампанія праходзіць у абстаноўцы вострай барацьбы. Класава-варожыя элементы кой-дзе спрабуюць скампраметаваць чэсных, адданых совецкай уладзе людзей. Задача партыйных арганізацый —своечасова выкрыць манеўры ворагаў. Неабходна значна шырэй разгарнуць агітацыйна-масавую работу, пры чым агітацыя павінна быць дзейснай, наступацельнай. Рашаючая задача—гэта ўсямернае ўмацаванне сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, забеспячэнне поўнай перамогі гэтага блока. Тав. Тупіцын патрабаваў ад райкомаў партыі неадкладнага выпраўлення ўсіх недахопаў у арганізацыйнай і агітацыйнай рабоце, правядзення выбараў у поўнай адпаведнасці з дырэктывамі нашай партыі, з патрабаваннямі сталінскага выбарчага закона.

На нарадзе абмеркаваны таксама чарговыя задачы гаспадарчай работы: падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы, выкананне плана лесавывазак і інш. А. Рабінавіч.

Дзейная падрыхтоўка

У Н-скай часці разгарнулася дзейная падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных. У падраздзяленні, дзе сакратаром партарганізацыі тав. Неміроўскі, агітатары — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі т.т. Казачэнка, Цельнюк і Петрухін праводзяць сярод байцоў і камандзіраў гутаркі па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Канстытуцыі БССР.

Вялікая работа праводзіцца сярод маладых байцоў. Для правядзення занятак па вывучэнню выбарчага закона і Канстытуцыі БССР з маладым папаўненнем вылучаны лепшыя агітатары, малодшыя камандзіры т.т. Барабаш, Пількевіч і Дацэнка.

Агітатары правялі з маладымі [illegible]мі гутаркі на тэмы: „Аб многанацыянальным Совецкім Саюзе і дружбе народаў", „Сталінская Канстытуцыя — самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце" і інш.

Намеснік камандзіра па палітычнай частцы тав. Краўчэнка ў гутарцы расказаў усяму асабоваму саставу аб значэнні выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных.

Выключная ўвага была звернута на складанне спісаў выбаршчыкаў. Гэта важнейшая работа была даручана малодшаму камандзіру Казачэнка і маладым байцам Юшкевічу, Сеннікаву, Майлюк, Гарбачову і іншым. Яны сур'ёзна адносяцца да выканання даручэння і своечасова саставілі спісы без памарак і скажэнняў.

П. Цімачоў

Участковыя камісіі не працуюць

Многа трэба патраціць часу выбаршчыку ў горадзе Пружаны, каб адшукаць выбарчы ўчастак. Ні адзін з пяці выбарчых участкаў горада не мае шыльдаў і ўказацелаў.

Да гэтага часу не ўсе ўчасткавыя камісіі маюць памяшканні для работы. Пятая ўчасткавая камісія зусім не мае памяшкання. Спісы выбаршчыкаў гэтага ўчастка вывешаны ў зале пасяджэнняў суда. Днём выбаршчыкі не маюць магчымасці зайсці праверыць правільнасць занясення іх у спісы, бо ў гэты час тут праходзіць разбор розных судовых спраў. Дзяжурэтвы з прычыны адсутнасці памяшканняў не наладжаны. У памяшканні трэцяга выбарчага ўчастка няма святла. Тут таксама не арганізаваны дзяжурэтвы членаў камісіі. Яшчэ ні адзін выбаршчык гэтых двух участкаў не наведаў участковую камісію, не праверыў вернасць занясення яго ў спісы выбаршчыкаў.

Спіс — важнейшы дзяржаўны дакумент, на аснове якога выбаршчык будзе атрымоўваць бюлетэні для галасавання. Да саставлення спісаў Пружанскі горвыканком (старшыня Рабіновіч) адвёсся несур'ёзна. Пры правядзенні гэтай вялікай і адказнай работы не быў прыцягнут актыў і агітатары. Як вынік у спісах дапушчаны пропускі выбаршчыкаў, скажэнні ў напісанні прозвішч і іншыя недакладнасці. Толькі па адным чацвертаму выбарчаму ўчастку ўжо выяўлен пропуск 69 выбаршчыкаў. На першым участку ў спісах дапушчан пропуск у напісанні 9 імён і імён па бацьку. Грамадзянін Кудраўцаў Нікалай не адзначан якога года нараджэння. Гользберг Шэйне няправільна запісан год нараджэння.

Толькі чатыры дні прайшло з дня вывешвання спісаў выбаршчыкаў, а на першым участку яны ўжо замазаны, многія прозвішчы цяжка прачытаць.

Такія грубыя скажэнні і недакладнасці ў спісах выбаршчыкаў не выклікаюць турбот у кіраўнікоў горвыканкома. Тут вічога не зроблена для таго, каб кожны выбаршчык мог асабіста знаёміцца і ўдакладніць вернасць занясення яго ў спісы. Як правіла памяшканні ўчасткавых камісій і агітпунктаў, за выключэннем памяшкання другога ўчастка, у дзённыя часы знаходзяцца на замку. Дзяжурэтвы членаў камісій на тых участках, дзе ўстаноўлены, пачынаюцца толькі з 7 гадзін і працягваюцца да 9 гадзін вечара. Відома, што за даве гадзіны дзяжурэтва ніякім чынам нельга забяспечыць магчымасці выбаршчыкам шырокай праверкі спісаў.

Невядома, зыходзячы з якіх меркаванняў, Пружанскі горвыканком усе выбарчыя ўчасткі размясціў у самым цэнтры горада, пры чым амаль побач адзін каля аднаго. Выбаршчыкі ўскраін горада вымушаны хадзіць на ўчастак за 1 — 2 кілометры.

На большасці выбарчых участкаў горада не разгорнута арганізацыйная і агітацыйная работа. Па кожнаму ўчастку вылучана па 18 — 25 агітатараў, але ні адзін з іх не пачынаў агітацыі за вылучаных кандыдатаў.

Ф. Кавалёў.

Прызыў моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА

Збываецца мара вызваленай моладзі

Тры дні працуе гарадская камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. Яшчэ запоўга да пачатку работы камісіі ў горвыканком сабіраецца моладзь, якая з радасцю адгукнулася на мерапрыемствы партыі і ўрада аб стварэнні працоўных рэзерваў СССР.

Кала 500 юнакоў горада падалі заявы з просьбай залічыць іх у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА. Зараз усе яны праходзяць камісію. Збываецца заветная мара вызваленай моладзі аб набыцці сабе жаданай прафесіі. Шлях да вучобы, да ведаў быў зачынен працоўнай моладзі ў былой панскай Польшчы. Толькі совецкая ўлада, прынёсшая прыгнечанаму народу вызваленне, стварыла ўсе магчымасці працоўным і іх дзецям для вучобы, забяспечыла гарантаванае права на адукацыю, згодна Сталінскай Канстытуцыі.

...У пакой, дзе працуе камісія, уваходзіць 15-гадовы юнак Анатолій Палякоў. Стройны, усебакова фізічна развіты хлопец. На мускулістым целе бронзай бліскаюць летні загар. Дасканалы медыцынскі агляд не знаходзіць ніякіх заган у здароўі Палякова.

— Вы залічаны ў рамесленае вучылішча, — гаворыць Палякову старшыня прызыўной камісіі тав. Салавей.

— А кім я буду па сканчэнні вучылішча?

— Токарам!

Задаволены рашэннем камісіі, з весёлым настроем і радаснай усмешкай пакідае юнак пакой...

Камісію праходзіць Ізраіль Мелер — сын муляра.

— Вучыўся дзе-небудзь раней? — пытаецца ў Ізраіля Мелера старшыня камісіі.

— Не, не вучыўся, — засмучана адказвае юнак. — Бацька большай частка быў беспрацоўным, а за вучобу раней трэба было плаціць.

Ізраіля Мелера камісія залічвае ў рамесленае вучылішча.

Адзін за адным праходзяць камісію юнакі. Яны з вялікай радасцю сустракаюць рашэнне аб залічэнні іх у рамесленыя вучылішчы. Ахопленыя радасным хваляваннем, юнакі падоўгу застаюцца ў калідоры горвыканкома і дзеляцца паміж сабой сваёй радасцю, выказваюць меркаванні і будуюць планы вучобы ў вучылішчы.

У трэці дзень работы камісіяпрапусціла 26 чалавек. Усяго за тры дні камісію прайшло 69 чалавек. 20 юнакоў залічаны ў школы фабрычна-заводскага абучэння. Яшчэ запоўга да пачатку работы камісіі ў горвыканком сабіраецца моладзь, якая з радасцю адгукнулася на мерапрыемствы партыі і ўрада аб стварэнні працоўных рэзерваў СССР.

* *
*

Трэба сказаць некалькі слоў аб недахопах у арганізацыі работы камісіі. Вечарам, як толькі пачынае прыступаць да работы камісія, па лесвіцы, што вядзе на другі паверх, і па калідору горвыканкома нельга прайсці. Тут таўпяцца дзесяткі юнакоў у чаканні выкліка.

Чаму-б камісіі не арганізаваць сваю работу так, каб выклікаць на пасяджэнне кожны вечар 20—30 чалавек, а не ўсіх, як гэта робіцца зараз. І, нарэшце, хіба нельга выдзеліць спецыяльнага чалавека, які-б з моладдзю, якая чакае праходжання камісіі, праводзіў гутаркі на розныя тэмы і чытку газет. Камісіі следуе падумаць над гэтым пытаннем і арганізаваць належнае культурнае абслугоўванне прызываемай моладзі.

Адчуваецца і другі недахоп. З бацькамі юнакоў, якія падалі заявы аб залічэнні іх у школы і вучылішчы камісія, як бачна, работы ніякай не праводзіць. 12 лістапада мы сустрэлі ў горвыканкоме жанчыну. Яна прышла з сынам, якому набольш 14 год.

—Хоча пайсці вучыцца ў рамесленае вучылішча,—гаворыць жанчына, паказваючы на хлопца,— але штосьці боязна.

—А што вас страшыць?

—А, ведаеце, ён будзе вучыцца на дзяржаўныя сродкі, а як стане дамастойна працаваць з яго заработку могуць адлічваць за вучобу.

Нам, безумоўна, прыйшлося растлумачыць, што абучэнне ў рамесленых і чыгуначных вучылішчах і ў школах фабрычна-заводскага абучэння дзяржава бярэ на свой рахунак і ніякай платы ні зараз, ні пасля сканчэння вучобы дзяржава ад навучаючагося не патрабуе.

Гэты выпадак сведчыць аб тым, што ў бацькоў узнікае мноства пытанняў, звязаных з уходам іх дзяцей у рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА. Камісіі следавала-б падумаць над тым, каб арганізаваць адпаведную масава-растлумачальную работу з бацькамі прызываемай моладзі.

Ал. Махнач.

На здымку: на прызыўным пункце Варашылаўскага раёна г. Мінска. Каля стала злева—Г. Л. Окола, які першым залічан у школу Ф. З. А. № 1

На 70 месц 400 заяў

12 лістапада ў Косаўскім раёне распачала работу камісія па прызыву моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. У райвыканком паступіла ад юнакоў і моладзі раёна на прадастаўленыя 70 месц 400 заяў. Пагэтаму адбор моладзі павінен быць самым дасканалым, каб пуцёўкі на вучобу атрымалі лепшыя з лепшых.

У першы дзень работы камісія разгледзела 11 заяў моладзі з гор. Косава і вёсак Белавічы і Скураты. З іх 6 чалавек атрымалі пуцёўкі ў Брэсцкае рамесленае вучылішча і Гайнайскую школу ФЗА. Маладыя патрыёты Валенцін Ерэмееў, Грыгорый Адзінец, Кедало, Іофе, Грэцкі і Нікалаеў, якіх камісія залічыла ў школу ФЗА і ў рамесленае вучылішча, шчыра дзякавалі совецкай уладзе і комуністычнай партыі за сталінскія клопаты аб моладзі.

Іўлеў.

Да пачатку занятак не падрыхтаваны

У абласці пачаўся прызыў моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. Маладыя патрыёты вызваленага народа з вялікім задавальненнем сустракаюць рашэнні прызыўных камісій аб залічэнні іх у школы і вучылішчы.

Да пачатку вучэбнага года ў рамесленых і чыгуначных вучылішчах і школах ФЗА засталіся лічаныя дні. Гэта абавязвае кіраўнікоў вучылішч і школ, партыйных, комсамольскіх і прафсаюзных арганізацый звярнуць належную ўвагу на тое, каб сустрэць заняткі падрыхтаванага.

У Брэсце, на базе майстэрняў горпромкамбіната, арганізавана рамесленае вучылішча № 8, якое павінна падрыхтаваць у першым навучальным годзе 25 токараў, 225 слесараў і столяраў. Як-жа гэта вучылішча падрыхтавалася да вучэбнага года?

Заходзячы ва двор вучылішча можна падумаць, што гэта нейкі склад. Па ўсяму двару раскіданы піламатэрыялы, дошкі, жалезны лом і інш. Месяц назад горвыканком і гарадскі камітэт партыі выклікалі рашэнне аб ліквідацыі памяшкання, якое займае падвучылішчам. Не гледзячы на гэта рашэнне другі паверх памяшкання і да гэтага часу не ліквідаваны.

Зусім дрэнна забяспечана вучылішча неабходнымі інструментамі і станкамі. Дастаткова сказаць, што на 25 вучняў, якіх неабходна навучыць токарнай справе, ёсць усяго пяць токарных станкоў. У слесарнай майстэрні ёсць толькі адзін фрэзерны станок, два свідравальных і два строгальных. І гэта на сто чалавек! Адсутнічаюць рэжучыя інструменты.

Памяшканне інтэрната падрыхтавана на 150 чалавек. На наш пытанне, куды будуць размешчаны астатнія сто вучняў, дырэктар вучылішча тав. Снежкоў станоўчага адказу не даў. Інтэрнат не забяспечаны пасцельнымі прыладамі. Для сталовай не набыта посуда, сталы і крэслы.

Застаўшыяся дні да занятак павінны быць выкарыстаны для поўнага завяршэння падрыхтоўкі майстэрняў, інтэрнатаў і сталовай. А. Відман.

У ДАПАМОГУ ВЫВУЧАЮЧЫМ ГІСТОРЫЮ ВКП(б)

Новая эканамічная палітыка і яе ажыццяўленне

I.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі (непа) быў ажыццяўлён партыяй Леніна-Сталіна ў 1921 годзе, пасля пераможнага завяршэння грамадзянскай вайны. Перад краінай паўстала тады задача аднаўлення народнай гаспадаркі.

Новая эканамічная палітыка была названа Леніным новай таму, што яна карэнным чынам адрозніваласа ад старой палітыкі, ад палітыкі ваеннага комунізма, якую партыя праводзіла ў годы грамадзянскай вайны.

Пераход ад палітыкі ваеннага комунізма да новай эканамічнай палітыкі, к непу з'явіўся зрэшт доказам правільнасці марксісцка-ленінскага палажэння аб тым, што палітыка і гаспадарка неадрыўлімы, што яны існуюць і развіваюцца разам, што новыя гаспадарчыя задачы патрабуюць і новай палітыкі.

У чым была сутнасць палітыкі ваеннага комунізма?

„У агні грамадзянскай вайны стварыўся і замацаваўся ваенна-палітычны саюз рабочага класа і сялянства. Гэты саюз трымаўся [illegible]ўнай аснове: сяляніна вызвалялі ад Совецкай улады зямлю і абарону ад памешчыка, ад кулака, рабочыя атрымоўвалі ад сялянства харчаванне па продразвёрстцы" („Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 238).

Продразвёрстка азначала адабранне ўсіх лішкаў хлеба ў сялянства ў карысць дзяржавы, для патрэб абароны краіны. Продразвёрстка была адзіна правільнай і неабходнай мерай за ўмоваў грамадзянскай вайны. Цэнтральная задача совецкай улады ў гэты перыяд заключалася ў тым, каб разбіць сілы контрреволюцыі — белагвардзейцаў і інтэрвентаў — і абараніць завяванні социялістычнай рэволюцыі. Без продразвёрткі нельга было рашыць гэтую задачу за ўмоваў гаспадарчай разрухі, без продразвёрткі нельга было ўтрымаць уладу рабочых і сялян, дыктатуру пролетарыята.

Палітыка ваеннага комунізма апраўдала сябе на практыцы. Яна была неабходнай палітыкай у годы грамадзянскай вайны, г. зн. да таго часу, пакуль ішла барацьба з белагвардзейцамі і інтэрвентамі. Але пасля таго, як грамадзянская вайна закончылася і краіна пачала пераходзіць на рэльсы мірнага будаўніцтва, палітыка ваеннага комунізма стала тормазам у развіцці народнай гаспадаркі. Яна перастала адпавядаць карэнным эканамічным інтарэсам рабочых і сялян.

„Пакуль вялася вайна, сялянства ішло на продразвёрстку і не заўважала нехваткі тавараў, але калі вайна скончылася і пагроза звароту памешчыка мінула, селяніны стаў выражаць нездавальненне із'яццем усіх лішкаў, нездавальненне сістэмай продразвёрткі і стаў патрабаваць, каб яго снабжалі дастатковай колькасцю тавараў.

Уся сістэма ваеннага комунізма, як адзначаў Ленін, прышла ў сутычку з інтарэсамі сялянства" („Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 238).

Годы грамадзянскай вайны, гаспадарчай разрухі былі годамі цяжкога жыцця для рабочага класа. Лепшыя сыны рабочага класа самааддана біліся супроць унутраных і знешніх ворагаў. Але голад і холад давялі сабе адчуваць. Гэта не магло не сказацца на паводзінах некаторай часткі рабочых.

„Немногія фабрыкі і заводы, якія яшчэ дзейнічалі, мелі вялікія перабоі ў рабоце. Рабочыя вымушаны былі займацца, саматужніцтвам, выробам зажыгалак, мешочні[illegible] [illegible]ваць класа[illegible] пролетарыята, рабочы клас распыляўся, частка рабочых ішла ў вёску, пераставала быць рабочымі, дэкласіравалася. На глебе голада і стомленасці праяўлялася нездавальненне часткі рабочых" (тамжа, стар. 238).

Нездавальненне сялянства і часткі рабочых было выкарыстана класавым ворагам для барацьбы супроць совецкай улады. Белагвардзейцы і эсэры арганізавалі ў розных частках краіны кулацкія мяцежы. Пры гэтым злейшыя ворагі совецкай улады спрабавалі прыкрыць свае контрреволюцыйныя дзеянні лозунгам „За Советы без комуністаў". Совецкая ўлада падавіла ўсе кулацкія паўстанні, падавіла арганізаваны эсэрамі контрреволюцыйны [illegible]штацкі мяцеж.

Улічваючы новае становішча ў краіне, стварыўшаяся пасля грамадзянскай вайны, улічваючы новыя адносіны класавых сіл, партыя перайшла ад палітыкі ваеннага комунізма да новай эканамічнай палітыкі.

II.

З пераходам да нэпа [illegible] развёрстка была замен[illegible] човым падаткам. Х[illegible] так быў па сваёму [illegible] продразвёрткі [illegible] човага падатку [illegible] магчымасці [illegible] хлеб [illegible] Гэта ста[illegible] мулы да р[illegible] гаспадаркі, да расшырэння пасеваў.

Замяняючы продразвёрстку харчовым падаткам, партыя зыходзіла з таго, што аднаўленне сельскай гаспадаркі на базе новай эканамічнай палітыкі дапаможа аднавіць прамысловасць, дапаможа сабраць рабочы клас у гарады і прамысловыя цэнтры. Харчовы падатак стварыў эканамічную аснову для саюза рабочых і сялян.

У новых умовах нэп з'явіў [illegible] адзіна правільнай палітыкай [illegible] совецкай дзяржавы. І партыя [illegible] біла ўсё для таго, каб [illegible] цавіць. Партыя перам[illegible] ціўленне ўсіх [illegible] (грацкістаў, „рабо[illegible] „левых комун[illegible] [illegible]тычных цэн[illegible] [illegible] ваенна-ж[illegible] [illegible]ізма. [illegible] [illegible] [illegible]

Школьнікі Гомеля вывучаюць майсковую справу ў абаронных гуртках Палаца Піонераў. На здымку: на занятках у адным з гурткоў стралковага спорта.
Фота К. Якубовіча.
Фотахроніка Белта.

Шматдзетныя мацеры атрымліваюць дапамогу

Кобрынскі раённы выканаўчы камітэт за бягучы год выплаціў 62 тысячы рублёў грошай дзяржаўнай дапамогі шматдзетным маперам.

Многія мацеры атрымліваюць па 4 тысячы рублёў дзяржаўнай дапамогі. Так, сялянка Марыя Фёдараўна Ежук з вёскі Петрыкі. Пяскоўскага сельсавета, атрымала 4 тысячы рублёў.

Маці 7 дзяцей Анна Васільеўна Баярчук з вёскі Мінянка, Ерэміцкага сельсавета, заявіла:

— Пры панаванні польскіх памешчыкаў і капіталістаў з нас многадзетных мацярэй смяяліся, прыгайвалі да жывёлы, а аб дзяржаўнай дапамозе і думаць не прыходзілася. Толькі зараз мы адчуваем клопаты нашага роднага совецкага ўрада аб выхаванні дзяцей. Я шчыра дзякую нашаму бацьку Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну за яго мудры закон і клопаты аб нас, шматдзетных мацерах і нашых дзецях.

Памятнік В. І. Леніну

У горадзе Кобрын на Плошчы Волі пабудаван помнік генію чалавецтва, правадыру працоўных усяго свету Уладзіміру Ільічу Леніну. Велізарнейшая фігура В. І. Леніна ва ўвесь рост устаноўлена на трохметровым п'едэстале.

Л. Дземідаў.

Аб беспарадках у Антопальскім кінотэатры

Вельмі многа беспарадкаў у Антопальскім кінотэатры. У ім нехапае крэслаў. Наведвальнік купіўшы білет вымушан стаяць у зале. У час дэманстрацыі кінокарціны па залу ўвесь час ходзяць наведвальнікі. Атрымоўваецца гэта таму, што каса прадае білеты аж да сканчэння сеанса.

У памяшканні кінотэатра даволі няўтульна. У ім працоўны раённага цэнтра не адчувае, што ён знаходзіцца ў сапраўды культурнай установе.

Цікава, чаму кіруючыя арганізацыі раёна мірацца з такім становішчам і не прымаюць мер да таго, каб ператварыць кінотэатр у сапраўдны ачаг культуры.

І. М. Варывончык.

КАЛГАСНАЯ ЗАМОЖНАСЦЬ

На ўкраіне вёскі Быч стаіць маленькая хаціна былога батрака маёнтка Тэмбіцкага Кузьмы Дабкевіча. У хаце гаспадара мы не засталі. Ён быў на жывёлагадоўчай ферме. Пажылая жанчына — жонка Кузьмы Пелагея,—штосьці рабіла ў сенцах, у хаце знаходзіліся дзеці. Старэйшы іх сын Васіль—вучань 3 класа і малодшыя Іван і Каця—вучні першага класа, толькі што звярнуліся з школы і селі за падрыхтоўку ўрокаў.

Гаспадыня Пелагея Маркаўна правяла нас у хату. На від старая, але жвавая жанчына некалькі хвілін была ў стане задумлёнасці, калі мы запыталіся аб мінулым яе жыцці. Потым, сабраўшыся з думкамі, яна распачала свой расказ.

— Трыццаць год мы працавалі на багатых. Працавалі многа, але атрымоўваць нічога не прыходзілася. Вечна галадалі. Дзеці не маглі вучыцца, бо за вучобу трэба было плаціць, а мы не мелі дастаткова сродкаў нават на хлеб...

Праз некаторы час мы накіраваліся на жывёлагадоўчую калгасную ферму. Кузьма падсцілаў стойлы чыстай і свежай саломай.

— Як прыемна працаваць, — загаварыў ён, — калі тваю працу ўсе бачаць, паважаюць і высока ценяць. Як ноч ад дня адрозніваецца сучаснае маё жыццё ад мінулага жыцця. Шчасце, якое я шукаў гадамі і не мог яго знайсці ў былой панскай Польшчы, мне, як і ўсім вызваленым сялянам, прынесолі Чырвоная Армія, комуністычная партыя і совецкая ўлада...

З дня арганізацыі ў вёсцы калгаса Кузьма Дабкевіч першым падаў заяву аб прыняцці яго ў калгас. Серца яму падказвала, што лепшага жыцця як у калгасе ён не знойдзе. І былы батрак не памыліўся.

На 722 працадні, якія выпрацавала сям'я Кузьмы Дабкевіча за 10 месяцаў, праўленне калгаса выдала авансам 65 пудоў жыта, 20 пудоў пшаніцы, 4800 пудоў бульбы і 900 рублёў грашыма.

Праўленне калгаса мяркуе ў будучым годзе свайму лепшаму калгаснику, былому батраку Кузьму Дабкевічу, пабудаваць новы дом.

* * *

Калгас у вёсцы Быч арганізаваўся вясной гэтага года. Калгаснікі далі сваёй арцелі імя Маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава. Малады калгас атрымаў ад дзяржавы бясплатна на вечнае карыстанне 200 гектараў пахатнай зямлі, 204 гектары сенажацей і 200 гектараў пасьбішча. Гэта лепшая зямля раней належыла памешчыкам ды асаднікам. Зараз яе гаспадарамі з'яўляюцца калгаснікі.

Дзесяць месяцаў прайшло з дня арганізацыі калгаса, а які бурны рост назіраецца ў арцельнай гаспадарцы! Калгас мае тры жывёлагадоўчых фермы, на якіх налічваецца звыш 300 галоў жывёлы. Толькі за апошні месяц ад жывёлагадоўчых ферм атрымана 80 тысяч рублёў прыбытку. Вялікія прыбыткі прынеслі калгасу такія галіны гаспадаркі, як агародніцтва, пчалаводства і садаводства.

У дружнай калектыўнай сям'і выраслі людзі, якія ў былой панскай Польшчы царцелі жудасны ўціск і эксплаатацыю. Заслужаным аўтарытэтам у калгаснікаў карыстаецца член сельскагаспадарчай арцелі Ілья Трэцяк. Ён выпрацаваў 545 працадзён і атрымаў на іх авансам 50 пудоў жыта, 15 пудоў пшаніцы, 3 600 пудоў бульбы і 600 рублёў грашыма. Па ўсяму калгасу ідзе добрая слава аб калгасніках Максіму Кот, Грыгорыю Каспяровіч, Паўлу Шыян, Грыгорыю Здановіч і іншых, якія з дня арганізацыі калгаса, працуючы на розначытайных работах, добрасумленна адносяцца да кожнага даручэння і пільна берагуць калгасную маёмасць.

Зараз усе калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі перажываюць асабліва радасныя дні. Тут разгарнулася актыўная падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных. У калгасе працуюць чатыры гурткі па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі. Гурткамі кіруюць комсамольцы-калгаснікі Трэцяк і Шэін, калгаснікі Петух і іншыя. Заняткі праходзяць пры вялікай актыўнасці слухачоў.

Міх. Папкоў.

Калгас імені Варашылава, Косаўскага раёна.



У дні святкавання XXIII-й гадавіны Вялікага Кастрычніка ўступіў у эксплаатацыю Мінскі радыёзавод імені Молатава. На здымку: ў лабараторыі завода канструктар Г. Г. Зусман правярае якасць абразцоў 3-х тыпаў прыёмнікаў—„Піонер", „Кім" і „Маршал", вытворчасць якіх ужо пачалася на заводзе.
Фота Б. Хеніна. *Фотахроніка Белта.*

Драматычны калектыў Гайнаўскага лесазавода

7 лістапада, у дзень святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай революцыі, абласны Дом народнай творчасці ў гарадскім тэатры Брэста арганізаваў паказ самадзейнасці драматычнага калектыва Гайнаўскага лесазавода.

Гэты драматычны калектыў існуе 7 месяцаў. Ён складаецца з рабочых і служачых лесазавода розных нацыянальнасцей: беларусаў, палякаў, украінцаў і рускіх. За перыяд сваёй работы калектыў паказаў гледачам — рабочым і служачым лесазавода, — п'есы А. П. Чэхава „Медведь" і „Юбилей", А. Н. Остроўскага „Лес", аднаактную совецкую п'есу „На границе" і ў сучасны момант працуе над п'есай Н. В. Гогаля „Женитьба". Калектыў працуе пад кіраўніцтвам рэжысёра, грамадскага работніка П. П. Секержынскага.

У гортэатры, у дзень слаўнай гадавіны Кастрычніка, калектыў паказаў п'есу А. Н. Остроўскага „Лес". Неабходна адзначыць дружную і сур'ёзную працу калектыва над гэтай цяжкай, класічнай п'есай. Веданне напамяць тэкста і мізанцэн дало магчымасць дасягнуць неабходнага тэмпа спектакля.

Адзін з недахопаў спектакля гэта нарушэнне стыля тагочаснай эпохі ў адзенні некаторых выканаўцаў.

З удзельнікаў спектакля, якія добра справіліся з сваімі ролямі, неабходна адзначыць выканаўцаў ролей: Нешчаліўцава (Радзівіновіч), Аксюшы (Алданава) і купца Васьмібратава (Младзяноўскі).

Задача драматычнага калектыва лесазавода разам з работай над класічнымі творамі ўключыць у свой рэпертуар лепшыя творы совецкай драматургіі. У сувязі з надыходзячымі выбарамі ў мясцовыя Советы депутатаў працоўных драматычны калектыў павінен сваёй работай дапамагчы мясцовым арганізацыям у правядзенні агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў.

Заводскі камітэт лесазавода, які да гэтага часу мала звяртаў увагі на работу драматычнага калектыва, абавязан шырока разгарнуць на заводзе мастацкую самадзейнасць шляхам арганізацыі розных самадзейных гурткоў на польскай і ўкраінскай мовах.

Улічыўшы ўсе дадатныя і адмоўныя бакі ў сваёй рабоце, драматычны калектыў Гайнаўскага лесазавода, безумоўна, здолее заняць адно з першых месц у вобласці ва ўсесаюзным агляде тэатральнай самадзейнасці. Крытык.

Чырвонаармейская самадзейнасць

У нашай часці многае зроблена ў галіне арганізацыі мастацкай чырвонаармейскай самадзейнасці. Струнны аркестр неаднаразова выступаў у Доме Чырвонай Арміі, на аглядах гарнізоннай самадзейнасці. Зараз ён рыхтуе новыя рэчы: марш з оперы „Кармен", „Венецыянскі месяц", „Мазурку", „Чардаш" і др.

Вялікай папулярнасцю ў часці карыстаецца выканаўца танца чырвонаармеец тав. Кузьмін. Ён таленавіта выконвае „Яблачка", „Рытмічны вальс" і іншыя танцавальныя нумары.

Харавы калектыў разучвае новыя масавыя совецкія песні: „Праважанне", „Фізкультурны марш", „Наша депутатка" і інш. Апрача гэтага ён рыхтуе песню „Чырвоныя коннікі" у музычнай апрацоўцы кіраўніка самадзейнасці чырвонаармейца Сабалеўскага. Значна вырас састаў хора. Ён папоўніўся новымі байцамі.

Аб паспяховым развіцці самадзейнасці яскрава сведчыць і той факт, што ў кожным падраздзяленні маюцца гурткі харавы, танцавальны і інш.

Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі часці створан ансамбль казахскай песні. Гэтым ансамблем кіруе чырвонаармеец — выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі — тав. Аскараў. У дні вялікага свята ансамбль выконваў песні: Аб Сталіне, „Ары таў", „Ачак" і др. Салісты—спевакі Османаў, Аскараў выконвалі народныя песні „Кара тургат", „Балкурай", „Алатаў".

Добра работаюць у часці і драматычны гурткі. Да іх работы прыцягнута значная колькасць жон начсастава. Драматычны гурток рыхтуе п'есу „Очную ставку". Падрыхтаваны п'есы „Анютины глазки", „Корни капитализма".

П. Буслоў.

Зах. АВА.

Выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі электрык-пражэктарыст В. Н. Верэйкін (Чорнаморскі флот).
Фота П. Саўчанка. Фота ТАСС.

Ф. В. Токараву прысвоена ступень доктара тэхнічных навук

Вышэйшая атэстацыйная камісія Камітэта па справах вышэйшай школы пры Соўнаркоме СССР прысвоіла вучоную ступень доктара тэхнічных навук без абароны дысертацыі інжынеру-канструктару Ф. В. Токараву. Тав Токараў — аўтар 30 буйных вынаходніцтваў. За выдатныя дасягненні ў галіне стварэння новых тыпаў узбраення Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР нядаўна прысвоіў яму званне Героя Социялістычнай Працы. (ТАСС).

Будаўніцтва дома інвалідаў

У вёсцы Сенкевічы, Косаўскага раёна, распачата будаўніцтва дома інвалідаў. На будаўніцтва дзяржаўай адпушчана 185 тысяч рублёў. Акрамя жылога памяшкання будуецца лазня, пральня і сталовая. У доме інвалідаў па сканчэнні будаўніцтва будзе змешчана 150 чалавек інвалідаў.

І. Л. Лаўрынчук.

Добры выхавацель

Высокіх вынікаў у социялістычным спаборніцтве дабіўся камандзір машыны старшына тав. Безрукавы. Тэхніку ён вывучыў, як гавораць, да вінціка, утрымоўвае сваю машыну ў выдатным становішчы, уважліва і любоўна ўхажвае за ёй. У штодзённым жыцці і вучобе малодшы камандзір паказвае прыклад неўстаннай работы над сабой, над узняццём сваіх ваенных і палітычных ведаў. Тав. Безрукавы лічыцца адным з лепшых агнявікоў у сваім падраздзяленні, ён добра ведае тэорыю агнявой справы, трапна паражае мішэнь.

Удасканаленне сваёй ваеннай спецыяльнасці ён цесна спалучае з упартай і настойлівай работай па аўладанню революцыйнай тэорыяй марксізма-ленінізма. Зараз тав. Безрукавы вывучае VII раздзел „Кароткага курса гісторыі ВКП(б)", мае добрыя і выдатныя адзнакі па палітычнай падрыхтоўцы.

Большэвіцкая скромнасць упрыгожвае валявога, энергічнага камандзіра. Ён ніколі не зазнаецца сваімі поспехамі, а ахвотна перадае свае веды таварышам, клапатліва і ўважліва адносіцца да запатрабаванняў падпарадкаваных.

Уся дзейнасць маладога камандзіра прасякнута высокай патрабавальнасцю да сябе і да сваіх падпарадкаваных. Ён цвёрдай рукой трымае воінскую дысцыпліну, непрымірым да ўсякіх недахопаў і недакладнасцей. У сваім экіпажы камандзір машыны дабіўся высокай вывучкі і злажанасці ў рабоце. Зараз тав. Безрукавы абучае і выхоўвае маладых байцоў. Многа клопатаў і ўвагі праяўляе камандзір аб сваіх людзях. Ён з ахвотай ім перадае свае веды, свой багаты практычны вопыт.

Зах. АВА. Е. Рахман.

Галавацяпы з горжылупраўлення

(Пісьмо ў рэдакцыю)

18 кастрычніка гэтага года я атрымала ў горжылупраўленні ордэр і пашпарт на кватэру № 1 па Совецкай 14 з двух пакояў, плошчаю ў 29 квадратных метраў. У гэты-ж дзень я заняла кватэру. Аднак жыць мне ў ёй доўга не прышлося. 6 лістапада вечарам я звярнулася з работы ў кватэру і застала ў ёй новага жыхара Кунцевіча з сям'ёй у чатыры чалавекі. Аказваецца, намеснік начальніка горжылупраўлення Касой на маю кватэру выдаў яшчэ адзін ордэр. Пасля гэтага я звярнулася ў горжылупраўленне і да начальніка комунальнага аддзела Панкевіча, але там мне адказалі: „Ну што-ж дапушчана памылка. Трэба цяпер мірыцца і жыць у адной кватэры і вам і Кунцевічу".

Вішнеўская,
інспектар Брэсцкага абласнога аддзела народнай асветы.

віцці гандлю пры наяўнасці ў краіне дробнай сялянскай гаспадаркі выклікае некаторы рост капіталізма. Але гэта не страшна совецкай дзяржаве, паколькі ў яе руках знаходзяцца ўсе камандныя эканамічныя вышыні: зямля, буйная прамысловасць, транспарт, банкі, манаполія знешняга гандлю. Апіраючыся на гэтыя эканамічныя рычагі, гаварыў Ленін, совецкая ўлада ў канечным рахунку выцесніць капіталістычныя элементы са сферы народнай гаспадаркі, забяспечыць перамогу социялізма.

Нэп прадпалагаў часовае адступленне, неабходнае, каб накапіць сілы для яшчэ больш рашучага наступлення на капіталістычныя элементы, для паспяховай барацьбы социялістычных элементаў супроць капіталістычных, для перамагання капіталістычных элементаў ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі і пабудавання социялістычнай эканомікі.

Таварыш Сталін даў класічнае вызначэнне нэпа:

„Нэп ёсць асобая палітыка пролетарскай дзяржавы, разлічаная на дасягненне капіталізма пры наяўнасці камандных вышынь у руках пролетарскай дзяржавы, разлічаная на барацьбу элементаў капіталістычных і социялістычных, разлічаная на ўзрастанне ролі социялістычных элементаў за ўшчэрб элементам капіталістычным, перамогу социялістычных элементаў, разлічаная на знішчэнне класаў, на пабудову фундамента социялістычнай эканомікі".

У гэтым вычарпальным вызначэнні і паказана сапраўдная прырода нэпа.

Прыняўшы новую эканамічную палітыку, партыя мабілізавала ўсе свае сілы на яе ажыццяўленне. Партыя пачала аднаўляць народную гаспадарку, накапліваць сродкі для індустрыялізацыі краіны.

Пры гэтым партыі прышлося перамагаць супраціўленне ўсялякіх ворагаў социялізма.

Трацкісты і другія ворагі социялізма выступілі супроць новай эканамічнай палітыкі, супроць ленінска-сталінскіх метадаў социялістычнага будаўніцтва. Маскіруючы свой здрадніцкі твар „левай" фразай, трацкісты сцвярджалі, што нэп ёсць суцэльнае адступленне. Трацкісцка - бухарынскія элементы, рэстаўратары капіталізма, спрабавалі выкарыстаць нэп у варожых социялізму мэтах. Адмаўляючы магчымасць перамогі социялізма ў нашай краіне пры наяўнасці капіталістычнага акружэння, трацкісты [illegible] перад „магутнасцю" [illegible] совецкага капіталізма і [illegible] на рэстаўрацыю [illegible] памешчыцкага ладу ў [illegible]. Партыя дала р[illegible] усім капітулянтам, [illegible] буржуазнае нутро.

Першы год правядзення новай эканамічнай палітыкі паказаў ужо яе правільнасць. Пераход да нэпа ўмацаваў саюз рабочых і сялян на новай эканамічнай аснове. Совецкая ўлада захавала ў сваіх руках камандныя эканамічныя вышыні. Сельская гаспадарка пачала хутка аднаўляцца; значныя былі поспехі ў аднаўленні прамысловасці і транспарта.

Народная гаспадарка павольна, але пэўна ішла ўперад. Вытворчыя сілы краіны раслі і мацнелі.

Характарызуючы вынікі першага года новай эканамічнай палітыкі, Ленін у сакавіку 1922 года гаварыў:

„Мы год адступалі. Мы павінны зараз сказаць ад імені партыі: — дастаткова! Тая мета, якая адступленнем праследвалася, дасягнута. Гэты перыяд канчаецца, або скончыўся. Цяпер мета высоўвецца другая — перагрупіроўка сіл" (Ленін, Т. XXVII, стар. 38).

Новая эканамічная палітыка была разліча[illegible] рыяд ад капі[illegible] ма. Пераходн[illegible] рызавалася [illegible] розных гасп[illegible] ноўнымі з я[illegible] ны, дробнатаварны. Відучук[illegible] лю адыгры[illegible] ład, але п[illegible] быў дроб[illegible] лены пераважна дробнай сялянскай гаспадаркай.

Асноўная задача новай эканамічнай палітыкі і заключалася ва ўсямерным развіцці і ўмацаванні социялістычнага ўкладу, у актыўным яго ўдзеянні на дробнатаварны ўклад і перабобцы яго на социялістычнай аснове, у барацьбе супроць капіталістычных элементаў.

Новая эканамічная палітыка павінна была забяспечыць ператварэнне многаўкладнай эканомікі ў адноўкладную, ператварэнне социялістычнага сектара гаспадаркі ў безраздзельна пануючую форму вытворчасці ва ўсёй народнай гаспадарцы.

У сваім апошнім вусным выступленні — у прамове на пленуме Моссовета 20 лістапада 1922 года — Ленін са ўсёй сілай падкрэсліў, што Расія непаўская будзе ператворана ў Расію социялістычную!

Партыя большэвікоў ажыццявіла гэты завет правадыра.

III.

[illegible] На першы [illegible] гады но[illegible] кі народ[illegible] асноўным [illegible] лада пака[illegible] льныя ра[illegible] зацыі кра[illegible] 1924—1926 [illegible] удаўніцтва [illegible] мільёнаў [illegible] для пад[illegible] няцця маламоцнай сялянскай гаспадаркі было адпушчана 290 мільёнаў рублёў.

З ростам народнай гаспадаркі палепшыўся матэрыяльны стан рабочых і сялян.

Апіраючыся на дасягнутыя поспехі, партыя па сваім XIV з'ездзе прыняла сталінскі план социялістычнай індустрыялізацыі краіны. Партыя прызнала, што Краіна советаў мае ўсё неабходнае для пабудовы поўнага социялістычнага грамадства ў абстаноўцы варожага капіталістычнага акружэння і што новая эканамічная палітыка толькі аблягчыць будаўніцтва социялізма.

І партыя, ажыццяўляючы новую эканамічную палітыку, дказала гэта на практыцы.

Партыя ператварыла ў жыццё ленінска-сталінскі план індустрыялізацыі краіны і ленінска-сталінскі кааператыўны план пераробкі дробнай і найдрабнейшай сялянскай гаспадаркі на социялістычнай аснове. У результаце ўсіх гэтых перамог наша краіна ператварылася з адсталай аграрнай краіны ў магутную індустрыяльную, эканамічна незалежную ад капіталістычнага свету дзяржаву, у краіну самай буйнай і тэхнічна ўзброенай сельскай гаспадаркі. Сялянства пад кіраўніцтвам рабочага класа, пры прамым удзеянні социялістычнай індустрыі пакінула назаўсёды спяг прыватнай уласнасці і перайшло ў калгасы. На аснове суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі быў ліквідаван самы шматлікі эксплаататарскі клас у СССР — кулацтва, апошні аплот рэстаўрацыі капіталізма. Перамогай калгаснага ладу была вырашана самая цяжкая і самая складаная задача социялістычнай революцыі.

„Гэта быў найглыбейшы революцыйны пераварот, скачок з старага якаснага становішча грамадства ў новае якаснае становішча роўназначны па сваіх выніках революцыйнаму перавароту ў кастрычніку 1917 года" („Кароткі курс гісторыі ВКП(б)", стар. 291).

Палітыка партыі ў галіне індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ажыццяўлялася ў бязлітаснай барацьбе з капіталістычнымі элементамі і іх трацкісцка-бухарынскай агентурай.

Як трацкісты, так і бухарынцы спрабавалі загубіць справу індустрыялізацыі, ліквідаваць саўгасы і калгасы, усялякімі імкнуліся аблягчыць зварот капіталізма ў СССР. Партыя бязлітасна выкрыла і граміла ворагаў народа.

Перамога социялістычных адносін у горадзе і вёсцы ператварыла социялістычную эканоміку ў безраздзельна пануючую сілу ў краіне, канчаткова і беспаваротна вырашыла пытанне „хто — каго" у карысць социялізма, супроць капіталізма.

(Працяг у наступным нумары)

232

У баку ад важнейшай справы

Вялікі правадыр і настаўнік усяго свету таварыш Сталін вучыць нас быць у любую мінуту гатовымі да абароны сваёй сацыялістычнай радзімы. „Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякія „выпадковасці“ і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі застаць нас знянацку“...

Гэтыя словы вялікага правадыра патрабуюць ад нас паўсядзённай абаронна-масавай работы па падрыхтоўцы рабочых, сялян і служачых да абароны краіны. Не зразумелі гэтай простай ісціны многія сакратары первічных партыйных арганізацый чыгуначнага вузла. Прайшло больш 8 месяцаў з таго часу, як у нашым горадзе сталі арганізоўвацца первічныя асоавіяхімаўскія арганізацыі. За гэты час пры жаданні магчыма было правесці значную работу. На справе гэтага няма. Ні адна арганізацыя не афармлена, саветы не выбраны. Адсутнічае ўлік членаў асоавіяхіма. На працягу многіх месяцаў не спагнаюцца членскія ўзносы. Гурткі па вывучэнню абаронай справы не работаюць. За ўвесь час у адным з аб'ектаў чыгуначнага вузла— кандуктарскім рэзерве была спроба наладзіць абаронную работу, але безрэзультатна. Арганізаваны гурток ППХА існаваў нядоўга, пасля некалькіх заняткаў ён распаўся.

Не ўдзяляюць партыйныя арганізацыі вузла ўвагі і наладжванню работы арганізацыі Чырвонага крыжу. Гэта масава-абаронная арганізацыя створана за апошні час толькі на некаторых аб'ектах, у большасці аб'ектаў яна не існуе.

Такое становішча зусім не турбуе сакратароў первічных партыйных арганізацый т.т. Судзіна і Кірычэнку, а таксама палітаддзел вузла. Так палітаддзел на працягу месяца сабіраецца правесці нараду сакратароў партарганізацый і кіраўнікоў абаронных арганізацый па пытанню разгортвання сярод рабочых і служачых абаронна-масавай работы. Гэту нараду ён пераносіць з аднаго дня на другі: з 15 кастрычніка на 29 кастрычніка, з 29 на 11 лістапада, а з 11 пераносіць на невядомае чысло.

Каму патрэбна такое кіраўніцтва важнейшай палітычнай справай — падрыхтоўкай насельніцтва да абароны сваёй радзімы? Нікому.

У гарадскім совеце Асоавіяхіма зусім правільна скардзяцца, што з гэтымі людзьмі нельга дагаварыцца. Памочнік начальніка палітаддзела тав. Чорных заўсёды супакойвае прадстаўнікоў тым, што палітаддзел не мае звестак аб становішчы абаронай работы на вузле, колькасці членаў Асоавіяхіма. Мне гэта будзе вядома тады,—адказвае ён,—калі правядзем нараду па абаронных пытаннях.

С. Румянцаў.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае паведамленне вярхоўнага камандвання: У той час, як англійская авіяцыя ў ноч на 12 лістапада была паралізавана бурай і небяспекай абледзянення, германскія злучэнні бамбардыроўшчыкаў прадаўжалі свае паспяховыя налёты на Лондан. На працягу 12 лістапада германскія самалёты таксама зрабілі налёты на Лондан. Газавы завод і складскія памяшканні ў Кенсінгтоне атрымалі цяжкія пашкоджанні. Паспяховай бамбардыроўцы падверглісь партовыя і транспартныя збудаванні, складскія памяшканні, ваенныя заводы, а таксама электрастанцыя ў Паўднёвай Англіі. Мініраванне англійскіх партоў прадаўжалася. У ноч на 13 лістапада некалькі англійскіх самалётаў скінулі бомбы ў Заходняй Германіі. Прычынены незначныя страты. Некалькі чалавек ранена. Германская авіяцыя на працягу ўчарашняга дня страт не мела. Дадаткова паведамляецца, што колькасць англійскіх самалётаў, збітых на працягу 11 лістапада італьянскім авіяцыйным корпусам, павялічылася да 10.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ўчора адзін германскі бамбардыроўшчык атакаваў і знішчыў чыгуначны віядук у Горгогейме (Паўднёва-Усходняя Англія). Такім чынам, знішчана важная чыгуначная лінія Ророгейм—Чычэстэр.

Злучэнне германскіх бамбардыроўшчыкаў падвергла паспяховай бамбардыроўцы Брайтон. Поўнасцю знішчана электрастанцыя. Гэтым нанесены выключна вялікія страты гораду і размешчаным тут ваенным прадпрыемствам.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што 12 лістапада дзеянні германскай авіяцыі заключаліся ў налётах невялікай колькасці асобных самалётаў. Непрыяцель скінуў бомбы ў радзе пунктаў, у тым ліку ў раёне Лондана. Матэрыяльныя страты і колькасць афіяр незначныя. Адзін германскі самалёт збіт каля паўночна-усходняга ўзбярэжжа Англіі.

11 лістапада днём англійская авіяцыя зрабіла налёт на акупіраваную Германіяй тэрыторыю і падвергла бамбардыроўцы базы падводных лодак у Лорыане і аэрадромы ў Бресце, Сен Брыо і Сен-Мало. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы. У ноч на 12 лістапада ніякія аперацыі англійская авіяцыя не рабіла.

11 лістапада над Англіяй было збіта 25 непрыяцельскіх самалётаў, з іх 13 італьянскіх і 12 германскіх. Англійская авіяцыя страціла 2 самалёты.

На працягу кастрычніка ў результаце паветраных налётаў на Англію сярод грамадзянскага насельніцтва налічваецца 6.334 забітых і 8.695 сур'ёзна раненых.

Паведамляецца таксама, што ў ноч на 5 лістапада ваенны карабель праціўніка напаў на караван англійскіх суднаў, які складаў з 38 параходаў. Англійскі ўспамагальны крэйсер „Джэрвіс Бэй“ уступіў у бой з германскімі караблямі. 9 англійскіх параходаў загінулі без весткі. Крэйсер „Джэрвіс Бэй“ у результаце адбыўшагося ўзрыва затануў. Усе астатнія англійскія параходы прышлі ў порт.

Дзеянні германскай авіяцыі

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе Германскае інфармацыйнае бюро, у ноч на 12 лістапада на Лондан было скінута звыш 200 тысяч кілограмаў бомб. Назіраўся рад новых пажараў і ўзрываў. Асабліва моцны ўзрыў адбыўся ў Харлздэне (раён Лондана), які выклікаў вялікія пажары. Бамбардыроўцы падверглісь таксама газавы завод, завод па вырабу матораў і склады. У результаце паспяховай бамбардыроўкі былі моцна пашкоджаны і ахоплены полымем чыгуначныя рамонтныя майстэрні.

У выніку выключна дрэннага надвор'я на працягу ўсяго ўчарашняга дня паветраных баёў не было.

Запросы ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС) Адказваючы на запытанні ў палаце абшчын, ваенны міністр Ідэн заявіў, што паміж камандваннем Англіі і авіяцыяй дасягнута дэталёвае і ўсеабдумлае пагадненне аб шчырым супрацоўніцтве. На працягу апошніх некалькіх месяцаў гэтае пытанне абмяркоўвалася міністэрствам авіяцыі і ваенным міністэрствам. У результаце гэтых перагавораў распрацаван план, далёка перавышаючы ўсё, што мела месца раней. Гэты план увойдзе ў сілу да 11 снежня. Далей Ідэн указаў, што ён не можа паўнасцю асвятліць характар распрацаванага плана, аднак супрацоўніцтва ўсіх радоў узбраення сухаземнай арміі і авіяцыі знаходзіцца зараз на трывалай аснове. Адказваючы на далейшыя пытанні, Ідэн указаў, што на Блізкім Усходзе гэтае пытанне вырашана здавальняюча.

Ідэн заявіў таксама, што колькасць ваенна-палонных англічан дасягае 40 тысяч чалавек.

ВАЙНА ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І ІТАЛІЯЙ

РЫМ, 13 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Стефані з Тіраны (Албанія), італьянская авіяцыя паспяхова прадаўжае дзеянні, ажыццяўляючы моцнымі хвалямі бамбардыроўкі У Эпіры італьянскія самалёты, перамагаючы заграджальны агонь грэкаў, скінулі бомбы на склады і ваенныя збудаванні.

Калоны праціўніка, прасоўваючыся ў раёнах Македоніі і Фесаліі, падвергліся налётам італьянскай авіяцыі. Праціўніку прычынены велізарныя страты. Італьянская авіяцыя ўдзельнічае ў перакідцы войск, указвае войскам шлях праз горы і дапамагае дзеянням артылерыі.

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 13 лістапада італьянцы прадпрынялі буйнае наступленне ў паўночным сектары пры падтрымцы артылерыі і самалётаў. Грэкі ўтрымліваюць пазіцыі ў раёне горнай цепі Пінд.

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што англійскія самалёты зрабілі 11 лістапада налёт на непрыяцельскі порт Валона (Албанія). Бомбы былі скінуты ў раёне размяшчэння доказ.

НЬЮ - ІОРК, 13 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, раніцой 12 лістапада 9 грэчаскіх або англійскіх самалётаў бамбардыравалі італьянскія войскі ўздоўж дарогі, звязваючай паміж сабой Скутары, Пуко і Кукес. Інтэнсіўнай бамбардыроўцы падвергнуты Эльбасан і Пограбец. Актыўнасць італьянскай авіяцыі зменшылася. Грэчаская кавалерыя ў сектары Эпір узяла ў палон яшчэ 500 італьянцаў. Захвачана таксама 850 мулаў.

Італьянскае контрнаступленне, прадпрынятае на крайнім правым флангу фронта ў раёне Корыцы (Корча), не ўвянчалася поспехам. У адным з сектараў гэтага фронта грэкі ўзялі ў палон 12 італьянскіх афіцэраў і 630 салдат і захвацілі вялікую колькасць ваенных матэрыялаў.

Ваенныя аперацыі ў Міжземным моры

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Марское міністэрства перадае наступнае паведамленне: „Англійскі ваенна-марскі флот нанёс сакрушальны ўдар італьянскаму флоту, асноўныя сілы якога знаходзіліся пад прыкрыццём берагавых батарэй на галоўнай базе італьянскага флота ў Таранто. Англійская марская авіяцыя таксама зрабіла ў ноч з 11 на 12 лістапада налёт на італьянскія караблі. Зробленым аэрафотаздымкам устаноўлена, што італьянскі лінкор класа Літторыо атрымаў настолькі моцныя пашкоджанні, што ўся насавая частка карабля знаходзіцца пад вадой, а сам карабль рэзка накрэніўся на правы борт. Другі лінкор Кавур таксама атрымаў моцныя пашкоджанні. Кармавая частка карабля, у тым ліку і адна з гарматніх вежаў, знаходзіцца пад вадой. Яшчэ не ўдалося ўстанавіць, але не выключана, што другі лінкор гэтага-ж класа таксама атрымаў моцныя пашкоджанні. Ва ўнутранай гавані Таранто знаходзяцца два крэйсеры, якія накрэніліся на правы борт і акружаны плямамі нафты. Паблізу гэтых крэйсераў заўважаны два дапаможных судны, кармавая частка якіх знаходзіцца пад вадой“.

Такім чынам, указваецца ў камунікеі, што з 6 лінкораў, якімі распалагаў італьянскі ваенна - марскі флот (2 — класа Літторыо і 4 надаўна рэканструіраваныя лінкоры класа Кавур), 3 знішчаны англійскай авіяцыяй.

Італьянскае абвяржэнне

РЫМ, 13 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Стефані абвяргае паведамленне марскога англійскага міністэрства аб тым, што 12 лістапада англійская марская авіяцыя знішчыла ў Таранто 3 італьянскіх лінкоры і іншыя ваенныя караблі. Спасылаючыся на зводку італьянскага камандвання, агенцтва заяўляе, што ў часе англійскага нападзення на Таранто сур'ёзна пашкоджан толькі адзін італьянскі карабль, прычым чалавечых афіяр не было.

ІТАЛЬЯНСКАЯ ЗВОДКА

РЫМ, 13 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе, што ў сектары Корыцы (Корча) спробы праціўніка прыблізіцца да італьянскіх перадавых пазіцый, якія размешчаны за межамі граніц у Эпіры, былі адбіты. Італьянская авіяцыя бамбардыравала пазіцыі праціўніка ў гарах Пінда, паблізу перакрыжавання дарог Мітцуні-Яніна і ў зоне Калабакі і Філіпад. Непрыяцельскія самалёты бамбардыравалі Дураццо (Албанія), дзе ёсць некалькі забітых і раненых.

У Паўночнай Афрыцы італьянскія самалёты бамбардыравалі ваенныя збудаванні Суэца і аэрадромы Каіра і Абукіра.

Ва Ўсходняй Афрыцы ў результаце сутычкі ў раёне Касала непрыяцель пакінуў на полі боя каля 50 чалавек забітымі. Захвачаны кулямёты, вінтоўкі і боеприпасы. Італьянскія страты вельмі незначныя. Італьянская авіяцыя бамбардыравала і падвергла кулямётнаму абстрэлу акопы, артылерыйскія пазіцыі, вайсковыя часці, ваенныя лагеры і танкі ў Огруб (у зоне Касала).

Праціўнік зрабіў налёт на Брындзізі, Таранто і Бары (Італія)

Зводка грэчаскага камандвання

АФІНЫ, 13 лістапада. (ТАСС). У апублікаванай учора вечарам зводцы грэчаскага вярхоўнага камандвання ўказваецца, што колькасць італьянцаў, узятых палон у раёне Пінда бесперапынна павялічваецца. Сярод захвачаных ваенных матэрыялаў знаходзяцца 75-міліметровыя гарматы, некалькі мартыр, кулямётаў і вінтовак. Захвачаны таксама 2 самалёты. Непрыяцель пакінуў на розных участках фронта больш 150 раненых. У вёсках, бамбардыраваных авіяцыяй праціўніка, ранена некалькі чалавек.

Англа-італьянская вайна

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ў Афрыцы англійская авіяцыя бамбардыравала італьянскія марскія базы Бенгазі, Дэрна і Тобрук. Знішчаны два непрыяцельскіх самалёты, якія стаялі на зямлі ў Дэрна. Некалькі другіх самалётаў і збудаванні моцна пашкоджаны. У Тобруку ўспыхнуў вялікі пажар.

У італьянскай Усходняй Афрыцы англійская авіяцыя бамбардыравала Май-Адага, Гуры, Керэн, Масауа і другія пункты. Бамбардыроўка выклікала моцныя ўзрывы ў Май-Адага і два пажары ў ваенным лагеры Керэна.

У камунікеі егіпецкага міністэрства абароны гаворыцца, што непрыяцельская авіяцыя вечарам 11 лістапада скінула некалькі бомб у раёне Суэцкага канала. Другія самалёты скінулі бомбы недалёка ад Каіра. Прычынены незначныя пашкоджанні. Чалавечых афіяр няма.

Германскі міністр працы на прыёме ў Мусаліні

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню Германскага інфармацыйнага бюро, сёння ў другой палавіне дня Мусаліні прыняў германскага міністра працы Зельдте.

Кампанія грамадзянскага непадпарадкавання ў Індыі

ЛОНДАН, 14 лістапада (ТАСС). Бамбейскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе аб тым, што кампанія грамадзянскага непадпарадкавання, пачатая Гандзі, пашыраецца. Аб гэтым сведчыць заява, накіраваная Гандзі віце-каралю, аб тым, што 1500 членаў кангрэса будуць прадаўжаць актыўнасць, пакуль яны не будуць заключаны ў турму. У спісе, прадастаўленым Гандзі, значацца відныя члены кангрэса, былыя міністры правінцыяльных урадаў і члены цэнтральнага заканадаўчага сабрання.

Андрэй выбаршчык

(З МІНУЛАГА)

Друкуемыя намі сёння два невялікіх апавяданні народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа — „Андрэй выбаршчык“ і „Выбар старшыні“ даюць яркі і праўдзівы малюнак бяспраўя працоўнага сялянства ў царскай Расіі. Гэты матэрыял з поспехам можа быць скарыстан нашымі агітатарамі ў гуртках пры азнаямленні працоўных з тым, як праходзілі „выбары“ ў Дзяржаўную Думу і мясцовыя органы ўлады ў дарэвалюцыйнай Расіі.

РЭДАКЦЫЯ

—Ну, Андрэй, глядзі-ж, трымайся,—ведай, за каго падаць голас!

Так гаварылі мужыкі свайму ўпаўнаважанаму, выпраўляючы яго ў горад на выбары депутатаў.

— Не ганіся за панскім чаем, бо пан часамі і лісіцаю можа прыкінуцца і руку табе падасць, і нават пацалуецца з табою.

— А што мне іх чай! Я і сваю скарынку хлеба з'ем, — гаварыў Андрэй: — не такі я дурак, каб прадацца за чай.

— Праўда, праўда, Андрэй! Табе і депутатам не брыдка быць за такія словы.

— Так, брат; у іх на языку мядок, а на сэрцы лядок.

— Эх, дзеці вы, дзеці! — махнуў рукою стары Хлёрка: — Нічога, як бачу, не будзе з гэтых выбараў.

— Як-то не будзе? Каб усе махалі так рукамі, то і ніякай не было-б Думы.

— Ты хочаш, каб к табе сама зямля з печы у рукі прышла?

— Свабоды бог з неба не скіне!

— Вядома!

Стары Хлёрка засароміўся —і хутчэй схаваўся за мужыцкія спіны.

— Смела, Андрэй, рэж там у горадзе праўду!

Андрэй хацеў сказаць мужыкам долую прамову, але ўсякіх думак так многа наплыло ў яго, што не ведаў з чаго пачаць, і толькі сказаў:

— Ну, братцы, бывайце здаровы.

— З богам, з богам, Андрэй!

І Андрэй закінуў на плечы палку, на якой была торба з хлебам і салам, і пехатой пайшоў на вакзал.

II

Мужыкі нецярпліва чакалі Андрэя з выбараў. На трэці дзень, на каторы Андрэй павінен быў прыехаць дадому, цэлая грамада мужыкоў у доўгіх кажухах, з палкамі вышла на вуліцу кала манастыркі і шумела, як лес у вецер.

А як рабіць тут не было чаго, то сядзі-тады можна было чуць, як стукала сяракоўка ад тоўстую мазолістую руку і як гарэла гарэлка, перакідваючыся проста з бутэлькі у мужыцкае горла.

Тут былі і такія, якія ўжо ўспелі напіцца і спявалі песні. А Антось Байбак нават пайшоў у скокі і сарванаваў пясок на вуліцы старымі остамі, на якіх нельга ўдзіна аднога аоцаса.

— Андрэй ідзе! Ідзе Андрэй!

Гоман як бачыш сціх, і ўся грамада заварушылася, як адзін чалавек.

— Толькі адзін Антось Байбак не хацеў злучацца з грамадою і не пераставаў арэць пясок, крычучы, каб на яго пазіралі, бо ён пазазваў, як даўней скакалі лявоніху.

Але на яго ніхто не пазіраў.

Андрэй ішоў, апусціўшы галаву. З адной кішэні доўгага сівога халата тырчала турэцкая булка, як раменны мужыцкі чэрк.

Мужыкі цесна абступілі Андрэя.

— Ну, чым-жа ты пацешыш нас, Андрэй?

— Андрэй махнуў рукой, і першае яго слова насіла імя той рэчы, каторую мужыкі на поле вывозяць.

— Каго-ж выбралі?

— Папоў ды чыноўнікаў.

— А ты дзе быў, карова ты? Чаго глядзеў? — накінуўся на Андрэя п'яны Антось: — ды я-б ім нюхаўкі параспорваў-бы!

— От ты ідзі лепш скачы лявоніху, — параілі яму мужыкі.

— Няхай вы па жары скачаце, — агрызнуўся Антось і плюнуў.

— А яны стаяць за мужыкоў? — пыталі зноў мужыкі.

— Дзе бачылі! Усе чарнасоценцы. І прыступу да іх няма.

— І чаем вас не частавалі?

— Чаму не. Але чорт яго піў. Гатовы сказаць яшчэ, што мужыкі жывуць па-панску. Гаварыў-жа адзін стрынгаль, што сорак гадоў таму мужыкі елі мякіну.

— Трэба было сказаць, што цяпер і гэтага няма, — загаманілі мужыкі.

— Дык мы і зрэзалі гэтага пана, аж брыдка яму стала... А якія яны былі добрыя! Проста хоць да раны прыкладзі. — А як прывязаўся, быў да нас адзін сакрэтнік, — проста хоць ты махалам махай — злазаўся, не здачэпіцца ад яго. Адзін з нашых раз і сказаў: „Хоць і пайдзем, але вушы заткнём, каб не чуць вашай гутаркі“.

— Гэта ўсёроўна як той палашук, каторага сілаю валаклі да царквы. Бачыць, што нічога не будзе, —„хоць, кажа, і пайду, але і губою і рукою не мяльну!“ — сказаў адзін мужык.

— А раз, браткі, такая вышла штука. Зайшлі да аднаго выбаршчыка. Ніхто не ведаў, што ён — прадсядацель „саюза рускага народу“, і аблаялі мы гэты саюз з астатніх слоў. Выбаршчык усё слухаў, ды вачыма маргаў, а потым як усхопіцца, усёроўна як на шыла сеў, ды як крыкне: „Гарадавых пазаву!“ Дык мы, брат, ходу. Грыгор з Н-павета, бегучы з другога паверху, зачапіўся ботам, паслізнуўся і пералічыў задам усе ўсходы. Дык мы гэтаму выбаршчыку кінулі ўсе чорныя галкі, але усёроўна яго выбралі — што мы значым? Колькі нас? Як выбралі депутатаў, дык усе чарнасоценцы давай біць у далоні, спяваць, а думаў, што лявоніху скакаць яшчэ пусцяцца... Стаялі мы, браткі, моцна.

У канцы адзін з мужыкоў сказаў прамову надта жаласную: „Скрыўдзілі, кажа, мужыкоў, не выбралі іх депутата. Хто будзе гаварыць у Думе аб цяжкай долі нашай“...

Мужыкі ўсе плакалі.

Стары Хлёрка выціснуўся на першае месца, абвёў усіх мужыкоў вачыма і сказаў:

— Цу што, чыя праўда?...

1911 г.

ВЫБАР СТАРШЫНІ

Ужо ад самага ранку крычалі выбарныя. Многа выпілі гарэлкі, а яшчэ больш піва.

У волаці я застаў пісара і яго памочніка. Заглядаў сюды так-жа дзед-сторож з чырвоным носам—табаку зажываў ды і ў гарэлцы быў не дурань. Ён здзьмухаў пыл, прыбіраў, як перад калядамі... Чакалі земскага.

А на „зборнай“, як на кірмашы, гаманіў сход.

— Вось хіба сягоння пілі дык пілі—кажа памочнік.— Гарэлку не чаркамі лічылі, а шклянкамі. Старшыня адразу даў дваццаць пяць рублёў, а калі выбяруць яго, то яшчэ, казаў, дасць гэтулькі. У нас ужо такі парадак: хто больш паставіць гарэлкі, той старшыня. А хто-ж больш паставіць, як не багаты. Сяляне нашы гаго не помняць, што гэту выпіўку старшыня пасля ў тры разы верне. У нас яшчэ і так бывае: выберуць старшыню, а назаўтра тыя самыя, што выбралі яго, прыходзяць цалаваць яму рукі.

— Дзын-дзын-дзын! Дзын-дзын-дзын! Земскі прыехаў.

Старшыня і пісар разам пабляднелі.

— Здраствуйце!

— Здравя жалаем, ваша сіяцельства!

Адзін выбарны здароўкаўся аддзельна. Усё ўжо спіхла, а ён, п'яны як зямля, ваткаецца, крычыць:

— Здраў'я жжжалаю ввваша пппбблагародзе!

— Ну, каго хочаце мець старшынёю.

— Т[illegible]го, [illegible] і быў!—крыкнулі разам.

— [illegible]ча земскі.

[illegible] „ладна“! Калі-б [illegible]цы, то і я ска[illegible]...

Старшыня стаяў белы, як снег. Згорбіўся ў дзве пагібелі, як овінны татка.

Я бачыў яго да схода: такі бравы, як генерал які. Я пазіраў на яго ды думаў: няўжо-ж гэта той самы чалавек. Быць не можа! Той быў роўны, а гэты—як абаранак. Той хадзіў па волаці, як сам цар, крычаў, аж шыбы брэзгалі, а гэты сагнуўся, як жабрак, і маўчыць, як немка—толькі вачыма лыпае. Той быў тоўсты, а гэты на цэлы пуд худзейшы.

Як толькі пачуў ён моц свае, павесялеў чалавек, выбраў мінуту, міргнуў пісару і язык высалапіў.

Земскі стаў нешта пісаць.

Здаецца ўсё зрабілася добра. І трэба-ж выскачыць якраз цапер Пілліну, селяніну з чорнай барадою. Пілліна ў волаці не было, як выбіралі старшыню—выпіваў з сабрам.

Убег ён у волаць, як куля, стукнуў дзверыма.

— Грамада! ужо выбралі? Апанаса Кветку? Каб вам дошкі сабралі! Каго вы выбралі? Яшчэ мала выпіў у вас крыві?

— Ціха!—кажуць. Тут-жа земскі.

— А што мне ён. Але вы абармоты! Га-зза. Ты старшынька? Сто рублёў прапіў! Каму трэба—падсунуў? Зноў кроў будзеш піць?..

Земскаму і старшыні хоць вазьмі засадзі туды вочы, дзе ніколі не сядзелі, а каб і сядзелі, то свету-б не бачылі.

А сход пазірае, як баран.

Беднага Пілліна пасадзілі ў халодную.

Гэтак пазалетась зн[illegible] старшыню кала Пінска.

Адказны рэдактар Г.Т. МІНЧУКОЎ

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1 — 17, 1—23, 6—16. Друкарня ім. Варашылава. УП — 572